

# СЯМЕЙНАЕ ВЫХАВАННЕ

**_В.У.Чэчат,_**
*загадчык кафедры педагогікі магістратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі, доктар педагагічных навук*

## ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА БАЦЬКОЎ

*Пад педагагічнай культурай бацькоў намі разумеецца педагагічная падрыхтаванасць іх як выхавацеляў, якая дае рэальныя станоўчыя вынікі ў працэсе сямейнага і грамадскага выхавання дзяцей. Педагагічная культура з'яўляецца састаўной часткай агульнай культуры бацькоў, у якой закладзены вопыт выхавання дзяцей у сям'і, што напрацаваны рознымі катэгорыямі бацькоў непасрэдна ў сваёй краіне, іншых краінах, што назапашаны ў народнай сямейнай педагогіцы. Педагагічная падрыхтаванасць уключае ў сябе пэўны аб'ём ведаў, перш за ўсё педагагічных, псіхалагічных, а таксама важнейшых медыцынскіх, прававых, эканамічных і інш., на аснове якіх у працэсе выхавання дзяцей выпрацоўваюцца выхавальніцкія ўменні і навыкі, развіваюцца педагагічныя здольнасці і майстэрства, ідзе пастаянны працэс самаадукацыі і самавыхавання.*

Практыка сямейнага выхавання паказвае, што вялікая колькасць бацькоў з'яўляецца педагагічна і псіхалагічна бездапаможнай як у наладжванні сваіх сямейных адносін, асабістага жыцця, так і ў выхаванні дзяцей. Мы зыходзім з таго канцэптуальнага па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лажэння, што педагагічная культура і выхаванне бацькоў у канчатковым выніку дапаможа ім:

пераадольваць няўпэўненасць у сваіх сілах як выхавацеляў;

нармалізаваць асабістае жыццё;

паляпшаць выхаванне дзяцей праз гуманізацыю іх жыццядзейнасці;

зніжаць і папярэджваць адмоўныя з'явы непасрэдна ў сям'і, а значыць, суадносна негатыўныя сацыяльныя працэсы ў грамадстве, якія з'яўляюцца вынікам слабай работы ўстаноў адукацыі па педагагізацыі і псіхалагізацыі сацыяльнага і сямейнага мікраасяроддзя.

Практыка паказвае, што ідэі і палажэнні аб педагагічнай культуры, мэтах і задачах навучання і выхавання бацькоў, іх ролі ў вырашэнні сямейных і сацыяльных праблем грамадства, якія звязаны з выхаваннем дзяцей, знаходзяць значнае месца ў даследаваннях і практычнай рабоце замежных і айчынных вучоных (псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў, педагогаў, сацыяльных педагогаў, сацыёлагаў). У розныя перыяды XX ст. існавалі разнастайныя падыходы да праблемы навучання і выхавання бацькоў і дзяцей, аздараўлення сямейных адносін і зносін, уключэння дзяцей у сістэму гэтых адносін і праз іх — у грамадскае жыццё.

Падыход першы. Сямейная атмасфера, устаноўкі, каштоўнасці і ўзаемаадносіны з'яўляюцца асноўнымі фактарамі развіцця асобы. Дзеці ўспрымаюць і авалодваюць культурай, засвойваюць нормы адносін і зносін у грамадстве праз бацькоў. Таму сям'я і з'яўляецца той пярвічнай групай, у якой дзіця фарміруе мэты і ідэалы асабістай сістэмы каштоўнасцей і ў якой яно, як чалавек, вучыцца жыццю.

У аснове сямейнага жыцця і выхавання дзяцей ляжаць наступныя прынцыпы:

жыццядзейнасць сям'і будуецца на разуменні кожным яе членам сваіх задач;

члены сям'і сумеснымі намаганнямі ствараюць цёплыя і дружалюбныя адносіны паміж сабой, паважаюць адзін аднаго як раўнапраўную асобу;

бацькі пазбягаюць канфліктаў з дзецьмі, з' яўляюцца іх дарадчыкамі і кіраўнікамі;

кантралююць дзеянні дзяцей не з пазіцыі сілы, а даюць ім магчымасць ужо ў раннім дзяцінстве адчуць і ўбачыць вынікі сваіх дзеянняў і паводзін.

Задачы выхавання бацькоў бачацца ў тым, каб

1) дапамагчы ім зразумець дзяцей;

2) увайсці ў іх лад мыслення, навучыцца разбірацца ў матывах іх учынкаў;

3) набываць і развіваць асабістыя метады выхавання дзіцяці з мэтай развіцця яго асобы;

4) устанаўліваць роўны ўдзел усіх членаў сям'і ў дамашніх справах *(А. Адлер, Р. Дрэйкурс).*

Падыход другі. Звыклыя паводзіны бацькоў і дзяцей магчыма змяніць з дапамогай методыкі перавучвання, праз вучобу. Мэта выхавання бацькоў заключаецца ў тым, каб навучаць іх быць "тэхнікамі паводзін", "інжынерамі акружаючага асяроддзя", так як змяненне асабістых паводзін бацькоў адбіваецца на паводзінах дзяцей. Задача заключаецца ў тым, каб бацькі навучыліся ацэньваць паводзіны дзяцей у трох накірунках:

1) ці робіць дзіця *нешта лішняе;*

2) ці робіць яно нешта недастаткова;

3) ці не цяжка яму пастаянна рабіць тое, што агульнапрынята і мэтазгодна (Ватсан, Б. Скінер).

Падыход трэці. Увага канцэнтруецца на камунікатыўных адносінах і навыках зносін (P.E.T. — Parent Effectiveness Fraining), г. зн. у цэнтры падыходу знаходзіцца ўменне перадачы пачуццяў ад аднаго чалавека да другога (пачуццёвая камунікацыя). Задачы выхавання і навучання бацькоў зводзяцца да выпрацоўкі трох асноўных уменняў:

1) актыўна слухаць тое, што хоча сказаць дзіця;

2) давесці да свядомасці дзіцяці ўласныя словы, г.зн. перадаваць свае пачуцці моваю, якая даступна разуменню дзіцяці;

3) выкарыстоўваць прынцыпы "абодва правы" — бацька і дзіця — пры высвятленні спрэчных пытанняў. Любая праблема ў сям'і вырашаецца бацькамі сумесна з дзецьмі ў наступным парадку:

1) вызначаецца сама праблема;

2) прадумваюцца варыянты яе вырашэння;

3) ацэньваецца кожны варыянт;

4) з усіх варыянтаў выбіраецца той, *які найбольш падыходзіць;*

5) шукаюцца (знаходзяцца) спосабы вырашэння праблемы;

6) праводзіцца ацэнка магчымага поспеху (выніку) (Т. Гардон).

Падыход чацвёрты. Заснаваны на трансакцыянальным (ад лац. transactio — учыненне, дагавор, здзелка, згода, якая дасягаецца ў *выніку ўзаемных уступак) аналізе.* Асоба кожнага індывідуума вызначаецца фактарамі, якія можна назваць станам "Я", уласным станам (ego states). Гэта спосаб успрымання рэальнасці, аналізу інфармацыі і рэакцыя індывідуума на дзеянні. Чалавек можа адчуваць, ацэньваць дзеянні і весці сябе ў розных сітуацыях па–рознаму: па–дзіцячаму (спантанна, інтуітыўна; праяўленне ўнутраных парываў у адказ на знешнія з'явы, у першую чаргу як рэакцыя на дзеянні маці і бацькі); па–даросламу (рацыянальна, аб'ектыўна на аснове атрыманых ведаў); па–бацькоўску (праяўленне назіральнасці, аналіз падзей і з'яў; набыццё нормаў паводзін, звычак і каштоўнасцей). Задачы выхавання і навучання бацькоў заключаюцца ў тым, каб яны ўмелі аперыраваць элементамі трансакцыянальнага аналізу пры вывучэнні сваіх паводзін ці ўзаемаадносін у сям'і; разумець праблемы, якія звязаны з сацыяль-

нымі сувязямі ў сям'і; аналізаваць зносіны паміж членамі сям'і, "бачыць" тыпы камунікацыі: дапаўняльныя трансакцыі, калі камунікацыя ажыццяўляецца быццам бы на адным узроўні; перакрыжаваныя трансакцыі, калі становішча бакоў не адпавядае адзін аднаму: скрытыя трансакцыі, пры якіх інфармацыя пры зносінах перадаецца ў скрытай форме (Э.Бернэ, Т. Харыс, М. Джэймс і інш.).

Падыход пяты. Прадугледжвае сістэму групавых кансультацый, што дапамагаюць бацькам выпрацоўваць уменні пераарыентоўваць свае ўстаноўкі ў залежнасці ад патрэбнасцей дзіцяці (Х. Джынатом).

Падыход шосты. Правядзенне апераджальнай падрыхтоўкі бацькоў і маці, іх бесперапыннае псіхолага–педагагічнае навучанне і асвета ў залежнасці ад узросту дзяцей, узбагачэнне педагагічнай культуры (С.В. Кавалёў, П.Ф. Лесгафт, А.С. Макаранка, В.А. Сухамлінскі). Галоўнымі шляхамі і сродкамі павышэння педагагічнай культуры бацькоў з'яўляецца:

ажыццяўленне дыферэнцыраванага навучання бацькоў і ўсіх членаў сям'і сумеснымі сіламі кваліфікаваных спецыялістаў (эканамістаў, юрыстаў, урачоў, сексолагаў, сацыяльных педагогаў і работнікаў, псіхолагаў, педагогаў і інш.);

выкарыстанне актыўных форм псіхолага–педагагічнага навучання (індывідуальных і групавых кансультацый спецыялістаў, трэнінгаў, аналізу праблемных сямейных сітуацый, дзелавых гульняў, семінарскіх і практычных заняткаў, дыспутаў, дыскусій, семінараў для бацькоў–выхавацеляў і дзяцей дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і інш.);

падрыхтоўка камплекта навукова–метадычнай і навукова–папулярнай літаратуры па сям'і і сямейнаму выхаванню для розных катэгорый бацькоў, кожнага члена сям'і.

Падыход сёмы. Удасканаленне ці перабудова сямейнага жыцця, сямейных адносін, гуманізацыя жыццядзейнасці бацькоў і дзяцей на аснове базісных для функцыянавання сям'і псіхалагічных складаючых:

1) пачуцці і думкі чалавека ў адносінах да самога сябе (самаацэнка);

2) спосабы, з дапамогай якіх людзі перадаюць адзін аднаму разнастайную інфармацыю, дзеляцца перажываннямі і меркаваннямі (спосабы камунікацыі);

3) правілы, якіх падтрымліваюцца і якімі кіруюцца людзі ў сваім жыцці (сямейная сістэма);

4) метады, з дапамогай якіх сям'я ажыццяўляе свае сувязі з другімі сацыяльнымі інстытутамі (сацыяльныя сувязі ) (В. Сацір). Для сталых сямей характэрны высокая самаацэнка, прамыя і чыстыя віды камунікацыі, гібкія і гуманныя правілы, якія арыентаваны на прынятце адзін аднаго, сацыяльныя сувязі адкрыты, для іх характэрны пазітыўныя ўстаноўкі і спадзяванні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ